Год II | Субота, 11 лютага 1922 г. | № 28 (37)

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:	Цана нумару 20 марак.	ЦАНА АБВЕСТАК:
Вільня, Афярная № 4, кв. 2.	Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.	За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1. Адміністрацыя—ад 10 да 3.	З перасылкай на 1 „ . . 500 „	ў тэксьце . . . . . . 75 м.
	За граніцу ў два разы даражэй.	за тэкстам . . . . . . 40 м.
		Для шукаючых працы на 10 проц. таней.

ТЭЛЕГРАМЫ.

ВАРШАВА 9. II. (А. У.). Сягоньня выяжджае да Лёндыну польскі пасол Врублеўскі.

ВАРШАВА 9. II. (А. У.) Пасол Радзішэўскі выяжджае да Парыжу, як прадстаўнік Міністэрства Скарбу у справе заграні̇чнай пазычкі.

МАСКВА 10. II. (А. У.). Тут адбылося сабраньне нямецка-расейскага таварыства, якое мае на мэці культурна-навуковае і прамыслова-гандлёвае збліжэньне.

З прычыны гэтага „Ізвестія" пішуць: Савецкай Рэспублікі адкрыта поле для нямецкага капіталу. Расея застанецца краем, вывозячым да Нямеччыны свае суроўцы і прывозячым адтуль гатовыя фабрыкаты. Савецкая Расея будзе імкнуцца у бліжэйшай будучыне да адраджэньня свае прамысловасьці.

МАСКВА 10. II. (А. У.). Тут забаставалі прафэсары Унівэрсытэту, з прычыны таго, што ім не выплачана месячная пэнсія.

МАСКВА 10.2. (А. У.) „Праўда" піша, што трэба царкоўныя скарбы ўжыць на барацьбу з голадам ў Расеі.

МАСКВА 10.2. (А. У.) У. Ц. І. К. выдаў дэкрэт аб скасаваньні чрэзвычаек. Гэта зроблена з прычыны безнадзейнай ўнутраннай сытуацыі, якая вымагае абавязковай заграні̇чнай дапамогі. У. Ц. І. К. праектуе зрабіць перад Гэнуэскай конфэрэнцыяй рэформу суда на Эўрапейскі лад.

Маюць намер зрабіць так-сама прамыслова-гандлёвую рэформу, каб расшырыць прыватную ініцыятыву і заінтэрасаваць заграні̇чны капітал.

МАСКВА 10.2. (А. У.) Прадстаўнік Нансэна ў Маскве, Горын, заявіў карэспандэнту А. У., што павудлуг яго (Горына) аблічэньняў, ў Расеі да новага ўраджаю памрэ ад пяці да дзесяці мільёнаў галодных.

ЛЬВОУ 10.2. (А, У.) З прычыны сьнежных заносаў затрымано шмат цягнікоў на адзінаццаці лініях у Львоўскай дырэкціі.

РЫГА 10. II. (А. У.) Латвійскі Устаўадаўчы Сойм прыняў закон аб аддзяленьні царквы ад дзяржавы, адкінуўшы артыкул аб забароне дзейнасьці езуітаў у Латвіі.

ВАРШАВА. 10 II. (А. У.) Паведамляюць з Босніі, Грэцыі і Рыму аб страшэнных сьнежных завеях, якія шалеюць тут ужо колькі дзён.

КАТАВІЦЫ 10. II. (А. Б.) Палажэньне ў Бытоме напружанае. Францускія афіцэры начуюць у казармах.

РЫГА 10. II. (А. У.) Лідэр сялянскай фракцыі Калініш, вярнуўшыся з Варшавы, заявіў, што Варшава эканамічна падносіцца надта шыбка, чаму спрыяюць багацтва Польшчы. З польскага вугля хутка будзе карыстаць Латвія. Польскі экспорт мае адкрытай дарогу на ўсход. У Польшчы няма антылатвійскіх настрояў.

⬥⬥⬥⬥

Абмен нотамі паміж Польшчаю і Ковенскаю Літвою.

Нота міністра заграні̇чных спраў Ковенскай Літвы да Польскага Ураду ад 3 лютага г. г.

Пане Міністр!

Літоўскі Урад з задаваленьнем прыняў да ведама заяву Польскага Ураду, заключанае ў яго ноце ад 30 студня г. г. Гэтая заява выяўляе пажаданьне Польскага Ураду найхутчэй завязаць правідловыя і прыязныя адосіны паміж абодвымі краямі.

Літоўскі Урад, на жаль, змушаны аднак, адначасна стверцзіць, што нота Польскага Ураду ня задавальняе літоўсай прапазыцыі ад 27 студня г. г., жадаючы выдзеліць з гэтай прапазыцыі Віленскае тэрытарыяльнае пытаньне, вырашэньне якога найболей важна для Літоўскага Ураду. Прапазыцыя Літоўскага Ураду ад 27 студня г. г. выразна мела на воку перагаворы аб Віленскім пытаньні, які явіліся перад Радаю Лігі Народаў і выказвала жаль дзеля іх безрэзультатнасьці, а разам з тым выяўляла пажаданьне Літоўскага Ураду, шляхам безпасрэдных зносін з Польскім Урадам дайсьці да мірнага вырашэньня польска-літоўскай спрэчкі.

У тэксьце ноты Літоўскага Ураду нічога гэткага ня было, каб можна было дапусьціць, што ён адмовіўся ад намеру вясьці дыскусію аб тэрытарыяльным пытаньні і што для яго толькі важны будучыя адносіны паміж абедзьвымі цзяржавамі.

Польскі Урад, бытцам, дапушчае, што маючыя быць перагаворы паміж Польшчаю і Літвою могуць быць аграні̇чаны толькі пытаньнямі, якія знаходзяцца ў зьвязку з установаю добрага суседзтва паміж абедзьвымі дзяржавамі. Польскі Урад выказваючы сваю гатоўнасьць пачаць перагаворы з мэтаю заключэньня дагавораў, датычачых зносін дыплёматычных, консульскіх, пашпартовых, жалезнадарожных, навігацыйных, пачтовых, тэлеграфных, гандлёвых і таможных, аднак Польскі Урад ня выказваецца зусім аб пытаньні польска-літоўскай спрэчкі.

Адзіны намёк на гэтую спрэчку, які ёсьць у ноце ад 30 студня г. г. гэта — заява Польскага Ураду, якая, зацьвярджаючы правамоцнасьць Віленскіх выбараў і, што адгэтуль выплывае, прызнаючы тую самую правамоцнасьць і вызванага імі да жыцьця Віленскага Сойму, загадзя кажа, што ён будзе лічыцца з пастановамі Віленскага Сойму, якія б яны ня былі. Гэтая заява зьяўляецца зусім праціўлеглай да становішча Літоўскага Уроду, выказанага ў яго ноце ад 27 студня, ад становішча якога Літоўскі Урад ня адступіцца.

Адначасна Літоўскі Урад пацьвярджае, што Польскі Урад у сваей ноце зусім нічога не кажа аб прынцыповым варунку ўсялякіх перагавораў, якія мае на ўвазе Літоўскі Урад і які зусім выразна быў выказаны ў яго ноце ад 27 студня, гэта: ўзварот да status quo (пачаткавага становішча) на віленскай тэрыторыі праз выпаўненьне эвакуацыі войскаў і адміністрацыі з тэрыторыі, якая ляжыць на поўнач ад лініі, прадугледжанай ў Сувальскім дагаворы.

Польскі Урад, бытцам, лічыць магчымым пачаць з Літоўскім Урадам перагаворы аб установе добрых суседзкіх адносін паміж абедзьвымі дзяржавамі, не даючы наперад задавальненьня за нарушэньне міжнароднага права, якое зроблена Польшчаю 9-га кастрычніка 1920 г. нарушэньнем Сувальскага дагавору.

Пры гэткіх варунках Літоўскаму Ураду нічога іншага ня застаецца, як толькі прасіць Польскі Урад аб найхутчэйшай прысылцы адказу на яго прапазыцыю ад 27 студня, якую Польскі Урад мае ласку разгледжваць, як няпадзельную цэласьць. Якраз Літоўскі Урад просіць Польскі аб ласкавым завядамленьні яго, ці згаджаецца ён на ўзварот да „status quo" на Віленскай тэрыторыі, гвалтам нарушанае замахам генэрала Жэлігоўскага і, ў разе задавальняючага адказу, ці гатоў ён да пачатку бэзпасрэдных польска-літоўскіх перагавораў адазваць сваі войскі і сваю адміністрацыю, якая знаходзіцца на поўнач зд лініі, прадугледжанай у Сувальскім дагаворы.

Літоўскі Урад адначасна мае гонар заявіць Польскаму Ураду, што ня здавальняючы адказ яго на гэтыя варункі ён будзе лічыць за адмову з яго боку ад пачацьця з Літоўскім Урадам бэзпасрэдных перагавораў, прапанаваны Літоскім Урадам у ноце ад 27 студня.

Прашу пана Міністра прыняць запэўненьне майго найвялікшага паважаньня.

(—) Юргутіс

Міністр Заграні̇чных Спраў.

Адказная нота міністра заграні̇чных спраў Польшчы да Ураду Ковенскай Літвы.

У адказ на вышэй паданую ноту міністр пан Скірмунт паслаў 7 лютага Літоўскаму Ураду такую ноту:

Пане Міністр!

Абмен нотамі з Літоўскім Урадам ад 27 студня, пазваляў прадугледжываць магчымасьць уступленьня абодвых Урадаў на шлях згоды, аднак, адказ Літоўскага Ураду ад 3 лютага г. г. прымушае думаць, што Урад Літоўскі ня мае таго шырокага пажаданьня установы суседзкіх і прыязных адносін паміж абедзьвымі дзяржавамі, якое мае Урад Польскі.

Прыймаючы пад Увагу, што першым варункам перагавораў ён ставіць патрэбаваньне, якое ён, хіба што і сам ня можа лічыць выпаўнімым, Польскі Урад думае, што перадусім самым важным ёсьць урэгуляваньня паміж абоімі Урадамі практычных пытаньняў, датычачых супольных інтарэсаў, якія могуць прывясьці да ўзаемнага збліжэньня, вынікі якога толькі магчымуць зрабіць дабрачынны ўплыў на жыцьце абодвых народаў і на агульныя адносіны абодвых краёў.

Кіруючыся гэтым вышэйадзначаным прынцыповым поглядам, я, ў маей ноце ад 30 студня г. г. стараўся асьцярагацца дыскусіі па ўсім пытаньням, якія маглі б яшчэ перад пачаткам перагавораў зрабіць перашкоды для перагавораў, такі пункт гледжаньня Польскага Ураду зьяўляецца, урэшце, суцэльца згоднай з разумнымі парадамі, прапанаванымі Лігаю Народаў абодвым Урадам.

Маю надзею, што Літоўскі Урад раздзеліць вышай выражаны мною пункт гледжаньня, у рэзультаце чаго хутка маглі-б быць пачаты безпасрэдныя перагаворы паміж абодвымі Урадамі.

Прашу Пана Міністра прыняць запэўненьне ў маім глыбокім паважаньні.

(—) Скірмунт.

Усе добра—ды не зусім.

У той час, калі людзі навакол стогнуць і наракаюць на дрэнныя часы, знайшоўся такі оптыміст, што проста здзівіў мяне. На мае пытаньне „што чуваць?" ён, заместа таго, каб вылічаць усё дрэннае і цяжкае, што так псуе цяперашнее жыцьцё, з нейкім вясельем, плывучым з глыбі душы, адказаў ні больш ні менш як: „добра, паночку".

— Як, добра?!—здзіваваўся я.

— Але, добра! Ціха, спакойна. Людзі жывуць амаль як ў даўнейшыя часы.

Вы гатовы падумаць, што чалавек гэты—амэрыканец, прыехаўшы пядаўна з кішанямі поўнымі даляраў, альбо шчасьлівчык, выйграўшы мільён. Нічога падобнага; гэтак гаварыў мне звычайны сялянін з пад Радашкевіч.

— А як-же бальшавікі, не непакояць?—пытаю я.

— Не, ціха! Нядаўна дзядзька мой каня ад іх прывёў...

— Каня?

— Але, каня. Вёска наша ляжыць на самай граніцы. Вось камуністы, з нашай жа вёскі (цяпер яны у Саўдэпіі камісарамі) ўкралі каня і павялі праз граніцу. А за граніцай дзядзькаў брат жыве. Ен і пазнаў каня. Тож, кажа, конь Мікіткі з Х. Каня затрымалі, а брат і наказаў дзядзьцы: „прыходзь, кажа, і забірай. Дзядзька мой кінуўся туды, кінуўся сюды, і ў гміну, і ў Вялейку, каб дастаць пропуск, ажна ў Вільні, праз знаемага дохтара, вырабіў сабе пропуск і паехаў у Менск. І, ведаеш, панок, прывёў такі каня, праўда чуць жывога.

— А як у бальшавізіі людзі жывуць?.

— Свабодную таргоўлю цяперака завялі, так што лягчэй трошкі. Толькі, праўду сказаўшы, гандляваць німа чым: што з поля збярэш, то амаль усё і аддай, а таго, што застанецца, самому ня хопіць, ня то што прадаць. Хто камісарам, альба спэкуляцыю вядзе, вядома, тым можна жыць, а звычайнаму чалавеку цяжка, надта цяжка. Вось дзядзьцы селядцоў купіў, хоча брату паслаць, што каня выратаваў; у Саўдэпіі не дастанеш іх ні за якія грошы.

— Гэтулькі селядцоў?—запытаўся я, паказваючы вачамі на вузялок, які мой раскашчык трымаў у руцэ.

— Не, селядцы на станцыі, а гэта кніжкі. У нас, бачыш панок, школа ёсьць, беларуская школа. Вос для дзетак лемантары вязу і іншыя кніжкі... Школу ужо як два месяцы адчынілі. Тры гады дзеткі ня вучыліся. Разбалавуціліся, страх. Вучыцеля маем чалавека з свайей вёскі. Кідаліся туды, сюды, прасілі, каб казённую адчынілі, больш няма рады, сабраліся з трох вёсак і пастанавілі школу адчыніць на свой рахунак і каб усе дзеткі вучыліся. Адна кабета ня мела мукі, каб даць вучыцялю, і ня хоча дзетак сваіх пасылаць у школу, дык сусед даў за яе ссынку; няхай, кажа, усе вучацца. А вучыцель файны, свой чалавек. Сказалі яму: „учы добра, каб дзеткі страх ведалі, ня так, як за бальшавікоў, каб інтэрнацыянал забыліся пяяць“. І ўзяўся ён за работу. Ужо беларускі лемантар прайшлі, цяпер вось папольску вучыць будзе. Хацелі адразу адзін дзень з беларускага, другі дзень з польскага вучыць, але настаўнік праканаў, што так толькі ўсе праблутаецца, Перш з адным скончыць трэба. Ах як вучацца дзеткі! Дочка ў мяне ёсьць, сем гадкоў, Анютка „Тата“, кажа, ужо лекцыі гатовы“. А назаўтра, прыдзе са школы ўжо ад дзьвераў крычыць, як і што казаў вучыцель. Усё раскажа, ўсё зьцяміць, гэткая малая бо, ведама, па нанашаму-ж вучыцяль да іх говора.“

І доўга яшчэ расказываў падарожны: як вучацц дзеткі, як „страх“ пазналі, як цяпер будуць вучыцца малітваў у беларускай мове. як будуць чытаць з кніжак, і разумець што ў іх напісана, ня так, як яны, калі прайшоўшы расейскі лемантар не маглі разумець таго, што ў іншых кніжхах напісана...

Агнем шчасьця гарэлі вочы майго расказчыка. Гледзючы на яго я зайздраваў яму і разумеў, чаму гэтакім „добрым“ выглядае яму ўсё тое, што ёсьць. Ён быў ініцыятарам школы, ён хлапаціцца, каб дастаць дазваленьне, ён пракаваў суседаў і праканаў іх. І цешыцца цяпер, што думкі яго ня былі творам фантазіі і стаўшы рэальным фактам прынясьлі дзеткам сьвет і „страх.“

— Толькі як далей будзе са школай ня ведаю, — пад канец сказаў ён і засупіўся, — ня ведаю, ці народ зможа на свой кошт вясьці школу. Хацелася-б, каб казна хаця настаўніку плаціла. Людзі кажуць, што па закону так павінна быць. А ці казна возьме настаўніка на свой рахунак, ня ведаю... Вось прыслалі мяне, далі грошы на дарогу, каб паклапаціўся. Ну, будзь здароў, панок, пайду ўжо.

З гэным мы разышліся.

Як шкада мне было гэткага чалавека. Ен ня ведае, ці казна возьме настаўніка на свой рахунак, хаця людзі кажуць, што па закону так павінна быць.

Я так сама ня ведаю, ці казна возьме настаўніка на свой рахунак. Ня ведаю так сама на які істнуючы закон зсылаюцца сяляне, кажучы, што казна павінна прыняць...

Я ведаю толькі тое, што іншы раз казна грошаў не дае, і ведаю таксама тое, што ёсьць закон Божы, каб няведаючага научыць і людзкія законы павінны падпарадкавацца яму. І калі ўлады нашы яшчэ не напісалі такога закону, — каб даць сьвет таму, хто працягвае да яго рукі, то ён павінен быць напісаны безадкладна, каб ня выклікаць гневу народнага!

У. М.

Я кахаю.

То ні слова, ні гаворка—
 То брыльлянтавы пацёркі.
То ні сэрца, ні каханьне—
 То квяцістае дыханьне.
То ні ласка і ні міласьць—
 То Арханельская шчырасьць.
То ня розум чалавека—
 То ўсезнаньне Бога—Сьвета.
То нябёс спакой пурпурны
 — Твае вочы, погляд цудны.
Я люблю цябе такую
Маю родную, сьвятую
Постаць беднай, постаць простай
Беларускай роднай вёскі,
Усей старонкі майго краю
І кахаю. Я кахаю...

Язэп Пілінаў.

З газэт.

„Українська Трибуна“, гаворачы аб будучых выбарах да Варшаўскага Сойму, выказвае думкі, цікавыя і для беларусаў.

Падробна разьбіраючы ўсе нявыгадныя варункі, ў якіх маглі-б апынуцца украінцы ў разе байкоту выбараў з боку ўкраінскага грамадзянства, газэта піша:

„Калі ўкраінцы прымуць учасьцьце ў выбарах, але толькі ня разабьюцца на асобныя групы, а выставяць агульна—ўкраінскі сьпісак кандыдатаў, то тагды толькі можа прайсьці вялікшая лічба іх кандыдатаў, якія, вайшоўшы ў паразуменьне з жыдамі, ліцьвінамі, беларусамі і другімі меньшымі нацыянальнасьцямі, ўжо змогуць, што небудзь зрабіць“.

Аб справе арыштаваных.

(Ліст да рэдакцыі).

Паважаны Пане Рэдактар!

Дайце, калі ласка, на страніцах Вашай паважанай газэты мейсца гэтаму лісту ў справе, якою зацікаўлены шырокія колы грамадзянства Віленшчыны, а нават і за яе межамі.

Я гавару аб справе арыштаў беларусаў і ліцьвінаў, арыштаў, якія мелі мейсца у Вільні 20 студня г. г. і ў пазьнейшыя дні.

Пасьля гэтых арыштаў, ня гледзячы на той шум, які паднялі на другі дзень газэты пэўнага напрамку, здавалася, што нічога экстраардынарнага, незвыклага, ў гэтых арыштах няма, тым болей, што ўсе газэты пісалі аб тым, што арыштаваных абвінавачваюць у пэўных дзяржаўных праступленьнях, прадугледжаных цэлым радам артыкулаў абавязваючага на тэрыторыі Віленшчыны Карнага Кодэксу 1903 г., а, значыцца, падлегаючых разгледжаньню і вырашэньню Суда.

Можна было спадзявацца, што дзеля важнасьці справы і зацікаўленасьці грамадзянства у гэтай справе, ўступнае сьледзтва хутка доўдзе да канца і ў неўзабаве справа дойдзе да Суда, гдзе праўда і выявіцца.

Тым часам стала іначай. Арыштаваных вывязьлі з Вільні і высадзілі іх за дэмаркацыйнай лініяй.

Вось гэтая апошняя акалічнасьць паказваецца з боку юрыдычнага зусім дзіўнай.

Артыкул 14-ы Уставы Карнага Судапраізводзтва кажа, што „ніхто ня можа быць укараны за праступны чын, падлегаючы разбору у Судзе, іначай, як толькі сьледам вайшоўшага ў законную моц прыгавара належачага Суда“. А тут улада адміністрацыйная сама карае людзей бяз суда і пры гэтым, такою караю, якая нават ня прадугледжана у Карным Кодэксу.

„Вываз“ арыштаваных за граніцу пярэчыць выразным прадпісаньням права, і дзеля гэтага зьяўляецца зусім зразумелым абурэньне сярод грамадзянства, якое гэты акт вызваў. Гэты акт падрывае веру ў істнаваньне права і справядлівасьці.

Улада, аддаючы распараджэньне аб вывазе арыштаваных за граніцу, зрабіла вялікую абмылку, якая можа даць зусім непажаданыя для нас вынікі.

Абмылку гэту трэба як найхутчэй направіць, але як — аб гэтым павінны думаць ня мы.

З вялікаю пашанаю

П. С.

Друкуючы гэны ліст, рэдакцыя згаджаецца з яго вывадамі і лічыць, што урад Сярэдняй Літвы у адказе сваім на інтэрпэляцыю „Адраджэньня-Вызваленьня“ у гэнай справе, выясьніць усё, што дагэтуль ў справе арыштаў ёсць нherяcным і незразумелым. (Рэд.).

Хроніка.

Бюджэт Сярэдняй Літвы.

Бюджэт Сярэднвй Літвы ад 1 студня да 1 ліпена ўжо апрацованы.

Выдаткі вылічаны на 2.919.000.000, даход—2.554.000.000, дэфіцыт 365.000.000.

На першым мейсцы сярод даходаў у лісьце стаіць падатак са спірытусу, які вылічаны на 975 міл., даход з тутуну 90 міл-, прамысловы падатак 390 міл., зямельны падатак 102 міл., гэрбавы — 149 міл.,

Дэфіцыт за другую палову 1921 г. выходзіць 58 пр. бюджэтнай сумы, цяпер ён выносіць толькі 12 проц. агульнага бюджэту.

Сьмерць Э. Шэкльстона.

У палове студня г. г. памёр вядомы англічанін Эрнест Шэкльстон, які дзеля навуковых мэтаў шмат ездзіў па палярных краёх.

Весткі з Слуцка.

Прыехаўшыя з Менску асобы гавораць, што ў працягу двух дзён Слуцк быў заняты паўстанцамі. („Віл. Утро.“)

Перад прыездам генерала Жэлігоўскага.

Паведамляюць, што для сустрэчы генэрала Жэлігоўскага арганізуецца камітэт. Генэрала будуць вітаць прадстаўнікі магістрату, ад духавенства і рабочых.

Доля высланых беларусаў і літоўцаў.

Ідуць чуткі, што Ковенская Літва ня прыймае да сябе высланых за дэмаркацыйную лінію з Сярэдняй Літвы беларусаў і літоўцаў. Да гэтага часу высланые жывуць у першай вёсцы нэйтральнай зоны, чакаючы, пакуль з Коўны ня прышлюць паведамленьня Ковенскага Ураду—прыме іх, ці не.

Гандаль у сьвяточныя дні.

Гандаль у сьвяточныя дні ня будзе дазволены. Просьба жыдоўскіх гандляроў аб дазваленьні гандлю у нядзелю пакінуты без увагі дзеля таго, што ва ўсіх заходня-эўрапнскіх дзяржавах, а так сама і ў Амэрыцы, устаноўлены сьвяточны отдых. Няма ні якай асновы рабіць у Вільні выключэньне.

Пратэст жонак.

Жонкі высланых з Вільні літоўцаў і беларусаў надрукавалі ў газэце „Litwa“ пратэст проці гэтай высылкі.

Над Неманам.

(„Глядзі № 27 Раніцы.“)

Жнеі і касцы ўзяліся за работу. Цяжарны плыт зьвязаны са старых таўстых сосьнаў, памалу праплывае і ідзе далей да чароднага згібу. Нешта нявыказна-горкае западае тагды ў душу. Жнеі пачынаюць пеяць сумную песьню, сагнуўшыся з сярпамі, а касцы мацней махаюць касамі і трава, як вінаватая, кладзецца тварам да іхніх ног.

Сонца пачырванела, набрыняла і соннае, адным берагам сваім дакранулася зямлі. Кроў бытцам разьліваецца па небі і хварбуе воду Нёмна...

Яшчэ крыху і лёгкая ахалода наступаючага вечару сьцеле для ночы пасьцельку з брылянцістай расы.

Далёка-далёка за згібам ракі, яшчэ раз пачуецца глухое адплываючае „тарнуў на лева-а-!а!,“ а ў бок ад ракі будзе раздавацца аддаляючыся харавая стройная песьня ідучых з работы касцоў і жнеяў.

* * *

Ноччу Нёман бывае страшны.

Паэту, які радзіўся ля яго берагоў, ён шмат чаго расказвае. Да першых пеўняў ён, сівы Нёман, гаварыць паэту аб даўнейшым слаўным жыцьці, калі ён ня чуў сумных песьняў і калі багацейшыя і прыгажнейшыя былі берагі яго. Нёман выводзіць да паэта русалак, вадзянікаў, заклікае з лесу лясуноў і чараўнікоў, якія ў доўгіх аповясьцях і абразох з мінулага расказваюць паэту аб яго прашчурах і аб будучыне патомкаў. Нёман на повярху водаў сваіх паказвае паэту прыбраныя вянкамі чоўны, ў якіх сядзяць сівыя князі, баяры і лірнікі. Праплываючы чарадаю, яны апавешчаюць паэту мінулае, якое цяперака зацерта і мала каму ведама; яны пытаюцца аб цяперашнім жыцьці сваіх патомкаў. Яны вымагаюць адказваць. Даведваючыся, яны горка крыўдзяцца і пагражаюць: — Куды пайшлі вы? Куды? Ціж шлях ваш ня быў роўны і шырокі? Ціж вы пабаяліся паліць вашу зямлю крывёю ворагаў? Дык ведайце, што болей пральецца яе цяперака, шмат разоў болей як ворагі пралілі вашай крыві... І Нёман робіцца ўвесь чырвоны, а трупы плывуць адзін за адным па цечаі, як плыты лесу...

* * *

А-а-а-а! Застагне лес і рэха разыйдзецца і з тог, і другога боку ракі і ўздоўж яе цечаі, куды плывуць трупы, далёка-далёка.

Паэту паказваецца, што яго жывога брата глумяць ворагі, яны зьвязалі яго ланцугамі, бьюць бізунамі і гоняць ўздоўж ракі. Брат хістаецца, падае, а, рук і ног яго, як і з усяго цела льецца кроў... А сэрца яго так моцна бьецца, што пераймаючы яго ўдары—лес гудзіць... Брат нявытрымоўвае і балюча стогне:

— А-а-а-а!

— Страшна! — зжахаецца паэт і закрывае твар рукамі.

Тагды ў вачох яго мітусяцца вогністыя кругі, якія мігавічна абертаюцца ў мора вагня. Паломіцца ўсё наўкола: гараць лясы, гараць вёскі, гарыць збожжа. Пажарам абхопляны ўвесь край, а людзі гэтага краю закаваны ў кайданы, а вочы іх завязаны чорнымі павязкамі...

— Я не магу болей... — Але паэт ня канчае свайго вокліку — пяе певен і страшныя прывіды нікнуць.

Скрозь ахалодны дымок ночы прабіваецца сьвет.

* * *

Загарэўся на небе ўсход і сонца ўжо на палову паднялося з-за небасходу. Відаць, як роўнай шырокай дарогай ідуць касцы, многа-многа касцоў і сталёвыя вытачаныя і зогнутыя іх косы блішчаць як маланкі пераліваючыся ад солнца і пахіляючыся ў тахт раўнамерным цьвёрдым паступам дужых здаровых людзей...

Язэп Пілінаў.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч.

Друкарня „Друк“ Субач 2.